УДК 37.035.6

***І.В. Музычка***
(ДУА «Сярэдняя школа № 10 г. Пінска»)

# ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ І ПАТРЫЯТЫЗМУ СРОДКАМІ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ

*Выхаванне грамадзяніна і патрыёта немагчыма без далучэння дзіцяці да духоўнай і матэрыяльнай спадчыны сваёй краіны. Чым больш поўнымі, глыбокімі, яркімі і змястоўнымі будуць веды дзяцей пра родныя мясціны, людзей, мінулае і сучаснае краю, тым болей эфектыўна будзе вырашана гэта задача.*

Вялікі патрыятызм пачынаецца з маленькага – з любові да таго месца, дзе жывеш. Ведаць сваю нацыянальную народную творчасць, родную мову, гісторыю і культуру – гэта значыць не парываць з вытокамі сваёй Айчыны, свайго народа.

Адной з галоўных задач выхавання ў сістэме адукацыі з'яўляецца «фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі» [1].

Неабходнасць працы над дадзенай тэмай узнікла ў сувязі з тым, што мы сутыкнуліся з жывой цікавасцю дзяцей да нашай народнай культуры. Дзеці малодшага школьнага ўзросту мысляць вобразна, успрымаюць навакольную рэчаіснасць эмацыянальна, таму патрыятызм у іх праяўляецца ў пачуцці захаплення сваёй краінай; менавіта гэтыя пачуцці неабходна выклікаць у працэсе работы па азнаямленню дзяцей з сваёй малой Радзімай і вялікай роднай краінай.

У сваёй групе на занятках мы прапанавалі асацыятыўны тэст, мэтай якога яўляецца выяўленне ўяўленняў аб значэнні слова «Радзіма». Дзеці павінны запісаць як мага больш слоў, якія асацыіруюцца с панящцем «Радзіма». Пасля апрацоўкі дадзеных стала зразумела, што ў першакласнікаў пакуль яшчэ вельмі мала асацыяцый (звычайна не больш за тры). Бацькам была прапанавана анкета па выяўленні іх адносін да далучэння дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры. Бацькі адзначаюць важнасць выхавання патрыятызму ў дзяцей, аднак дома надаюць гэтаму мала ўвагі, так як лічаць, што вядучая роля ў гэтай рабоце належыць дзіцячаму саду і школе. Таму і ўзнікла неабходнасць сістэматызаванай мэтанакіраванай работы ў дадзеным накірунку, мэта якой заключана ў далучэнні дзяцей да асноў нацыянальнай культуры, духоўных каштоўнасцей беларускага народа, у садзейнічанні патрыятычнаму выхаванню сродкамі народнай педагогікі.

На пачатковым этапе работа была накіравана на стварэнне прадметнага асяроддзя і папаўнення матэрыялаў па тэме. Дзеці і іх бацькі дапамаглі стварыць у групе бібліятэку пра горад Пінск і Беларусь; папоўнілі картатэку беларускіх прымавак і прыказак, народных гульняў, звычаяў і абрадаў; распрацавалі мэтанакіраваныя дыдактычныя гульні «Наша Радзіма – Беларусь», «Святы нашай краіны», «Мая малая Радзіма». Таксама дзеці сумесна з бацькамі ўнеслі свой уклад у стварэнне «Музея дзяцінства», які адчыніць дзверы ў наступным навучальным годзе. Былі прынесены лялькі нашых бабуль, рэчы побыту, цацкі і інш.

Сабраны матэрыял быў сістэматызаваны па наступных тэмах: «Фальклор беларускага Палесся», «Народныя гульні», «Рэчы побыту сялянскай хаты», «Мой родны горад», «Звычаі і абрады Палесся». Значная ўвага нададзена знаёмству з горадам, яго архітэктурнымі і гістарычнымі помнікамі, якія з'яўляюцца культурнай каштоўнасцю. Сабраныя матэрыялы дапамаглі наладзіць разнастайную работу па грамадска-патрыятычным выхаванні малодшых школьнікаў.

У рабоце з дзецьмі мы імкнемся выкарыстоўваць такія формы і метады работы, якія ім падабаюцца і з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі.

Фарміраванне грамадзяніна, патрыёта сваёй Радзімы у першую чаргу пачынаецца з праявы любові да бацькоў, да сваёй сям'і. Сям'я – гэта дарослыя і дзеці, якія жывуць разам, любяць адзін аднаго і клапоцяцца адзін пра аднаго. Работа па азнаямленню з сем'ямі дзяцей пачынаецца з гутарак; кожны з дзяцей прыносіць сямейныя фотаздымкі. Падключаюцца да працы бацькі (сумеснае афармленне альбома «Мая дружная сям'я»).

Вялікае значэнне мае і бліжэйшае акружэнне: дом, вуліца, на якой жыве школьнік і дзе размешчана школа. Паколькі мы працуем з дзецьмі-першакласнікамі, таму пачынаем з іх знаёмства са школай, бо найбольшую колькасць часу яны знаходзяцца менавіта тут. Спачатку праводзім гутарку аб школе, знаёмім дзяцей з эмблемай школы, тлумачым, чаму яна так называецца. Затым праводзім аглядную экскурсію па школе, знаёмім дзяцей з тымі памяшканнямі, якія ў нас маюцца, расказваем аб працы людзей, якія працуюць у нашай школе. Пасля экскурсіі афармляем фотаальбом «Наша школа».

Адна з складаных частак патрыятызму – выхаванне любові да роднай прыроды на прагулках і экскурсіях. Паступова ў дзяцей фарміруецца ўяўленне аб родным горадзе, прырода становіцца больш блізкай і зразумелай, дзеці імкнуцца што-небудзь зрабіць для



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яе, адчуваюць пачуццё адказнасці перад ёй. Матэрыял, атрыманы ў ходзе экскурсій і заняткаў па тэме «Гэтая вуліца мая», замацоўвалі падчас гульні з выкарыстаннем вырабленага макета вуліцы, дыдактычнай гульні «Транспарт на вуліцы», сюжэтна-ролевай гульні «Мы – пасажыры».

На наступным этапе мы наведалі ў нашым горадзе Музей беларускага Палесся, дзе дзеці пазнаёміліся з бытам палешукоў, нацыянальнымі касцюмамі, побытам і рэчамі сялянскіх хат, даведаліся аб прызначэнні тых ці іншых прадметаў (падчас інфармавання падкрэслівалася прыгажосць і майстэрства чалавечых рук). Віды народнай творчасці дазваляюць падвесці дзяцей да глыбокага разумення сэнсу фальклорных твораў і самабытнасці народных промыслаў, сувязі народнай творчасці ў яго розных праявах з побытам.

Атрыманыя ў ходзе экскурсіі веды дзеці лёгка перадавалі на занятках па маляванні, аплікацыі і лепцы, з радасцю адгукаліся на развучванне беларускіх песенак, калыханак. На занятку па маляванні дзецям было дадзена заданне размаляваць «Сялянскую кашулю» беларускім арнаментам, упрыгожыць «Бабулін куфар»; з задавальненнем дзеці ляпілі посуд з гліны.

У вуснай народнай творчасці як нідзе захаваліся асаблівыя рысы беларусаў, уласцівыя ім маральныя каштоўнасці, уяўленні пра дабро, прыгажосць, праўду, смеласць, працавітасць, вернасць. На занятках у ходзе рухомай гульні, прагулак, чытання дзеці знаёміліся з прымаўкамі, загадкамі, прыказкамі, казкамі, далучаючы іх да агульначалавечых маральна-эстэтычных каштоўнасцей. Асаблівае месца ў творах вуснай народнай творчасці займаюць паважлівае стаўленне да працы, захапленне майстэрствам чалавечых рук. Дзякуючы гэтаму фальклор з’яўляецца найбагацейшым крыніцай пазнавальнага і маральнага развіцця дзяцей.

Навучэнцы групы падоўжанага дня наведваюць гурток-ансамбль «Вясёлыя лажкары», праграма якога прадугледжвае паэтапнае навучанне школьнікаў гульні на лыжках і беларускіх народных інструментах. Дадзеная праграма накіравана на далучэнне дзяцей да вытокаў беларускай народнай культуры, адраджэння культурных каштоўнасцяў і развіццё творчых здольнасцяў дзяцей.

На наступным этапе працы мы пазнаёмілі дзяцей з беларускімі народнымі традыцыямі і звычаямі. Сумесна з бацькамі мы наведалі ў гарадскім парку культуры і адпачынку святкаванне Масленіцы. На масленіцу прынята гуляць у народныя гульні, вадзіць карагоды, пекчы бліны і спальваць пудзіла; у дзяцей заўсёды застаецца вельмі шмат ураджанняў пасля такога свята.

Напярэдадні хрысціянскага свята Тройца мы пазнаёмілі дзяцей з абрадам «Ваджэнне куста», які быў пачуты і запісаны са слоў бабулі. Дзеці прынялі актыўны ўдзел у тэатралізаваным абрадзе.

Працуючы над зададзенай тэмай, мы прыйшлі да высновы, што выхаванне патрыятычных пачуццяў у школьнікаў – працэс складаны і працяглы. Гэтая праца павінна праводзіцца сістэматычна, планамерна ў розных відах дзейнасці і па розных напрамках: выхаванне любові да блізкіх, школы, прыроды, роднага горада і сваёй краіне.

Патрыятычнае выхаванне павінна насіць комплексны характар, пранізваць усе віды дзіцячай дзейнасці, ажыццяўляцца ў паўсядзённым жыцці і на занятках па азнаямленню з навакольным асяроддзем. Ад дарослага шмат у чым залежыць, чым цікавіцца дзіця, пра што яно пытаецца. Таму асабліва важная актыўная пазіцыя выхавальніка – жаданне і ўменне сфарміраваць у дзяцей патрэбнасць удзельнічаць у справах на карысць навакольных людзей і жывой прыроды, дапамагчы ім усвядоміць сябе неад’емнай часткай сваёй малой Радзімы, грамадзянінам Беларусі.

Спадзяемся, што атрыманыя ў групе падоўжанага дня веды спатрэбяцца дзецям у іх далейшым жыцці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2011. – 400 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова